***-ейш-***. У мове аналізуемага твора ўжываюцца і формы вышэйшай ступені параўнання, якія ўтвараюцца пры дапамозе суфікса ***-н-*** і бяссуфіксным спосабам – пры дапамозе канчаткаў. Формы з суфіксамі ***-ш-***, ***-ейш-*** колькасна пераважаюць – пяць з дзевяці зафіксаваных (55 %). Выяўлены дзве формы з суфіксам ***-н-*** і дзве, якія ўтвораны бяссуфіксным спосабам: **живот же их изверху *суше*** (29 адв.), **место которое *хворейшее*** (18 адв.), **ино той *налепший* и таина твоя *беспечалней*** (12 адв.), **печен же теплотою под сим тут же велми *студеней*** мяса (30 адв.), **теплота же детиная *болши* теплоты молодцовыя теплота ж молодцовая *острей* теплоты детиныя** (29), **един *студенее* другаго или теплей** (31).

Адзначаны і суплетыўныя формы вышэйшай ступені параўнання, утвораныя пры дапамозе суфікса **-ш-**: **изо всего света нижняго а сотвореніе *лепшаго*** (11), **сии же животы его *горши* всих иных животов** (24).

Традыцыйным для старабеларускай пісьмовай мовы было ўтварэнне найвышэйшай ступені параўнання якасных прыметнікаў пры дапамозе прыстаўкі агульнаславянскага паходжання **най-**. Ужывалася таксама і сцягнутая форма прыстаўкі **на-**. У "Арыстоцелевых варотах" ужываюцца формы выключна з прэфіксам **на-**: ***налепший* царь подобенъ орлу**... ***напущи* царь подобен ко стерву** (3 адв.), **александръ водися з *наменшим* врагом своим яко з *наболшим*** (5), **а *нагорши* очи что походило на зеркость ферзину** (21).

Апісальныя формы, утвораныя шляхам далучэння слоў тыпу **вельмі, самы** да прыметнікаў, у "Арыстоцелевых варотах" не адзначаны. Гэты спосаб перадачы найвышэйшай ступені параўнання некаторымі даследчыкамі ўвогуле выключаецца (гл. Юргелевич 1974, 202).

Аналіз прыметнікаў у "Арыстоцелевых варотах" сведчыць аб зменах, якія адбываліся з гэтай катэгорыяй мовы ў старабеларускі перыяд. Гэтыя змены былі найперш звязаны з пашырэннем поўнай формы прыметнікаў, з агульнай тэндэнцыяй да уніфікацыі флексій. Сістэма скланення прыметнікаў, як і ступені параўнання якасных прыметнікаў разглядаемага тэксту, у большасці падпарадкоўваецца традыцыям старабеларускай мовы.

ЛІТАРАТУРА

Б у л ы к а А.М., Ж у р а ў с к і А.І., К р а м к о І.І. Гістарычная марфалогія беларускай мовы. Мн., 1979.

Ю р г е л е в і ч П.Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мн., 1974.

Я н к о ў с к і Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мн., 1989.

Паступіў у рэдакцыю 01.10.2002.

***Наталля Юр'еўна Перавалава*** – аспірантка кафедры гісторыі беларускай мовы. Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, дацэнт М.Р. Прыгодзіч.

*Ю.М. ЛУК'ЯНЮК*

# СІСТЭМНАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

На основе анализа дефиниций и структуры терминов, которые входят в те или другие классификационные микрогруппы, устанавливается, насколько характерна философским терминам системность в плане содержания и в плане выражения.

On the basis of the analysis of definitions and the structure of the terms contained in different classification microgroups, the system degree of structural and semantic organization of philosophical terms is established.

Сучаснае мовазнаўства разглядае мову як адзіную знакавую сістэму. Пад сістэмай разумеюць "сукупнасць узаемазвязаных або пэўным чынам упарадкаваных элементаў, якія ўтвараюць некаторае адзінства. Важнейшай



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

часткай сістэмы служыць структура, якая ўяўляе сабой сукупнасць устойлівых узаемаадносін паміж элементамі сістэмы або спосаб упарадкавання элементаў у сістэме...” (Плотнікаў 1986, 227).

Выкарыстоўваюць сістэмны падыход і пры вывучэнні тэрміналогіі. Адзначым, што існуе два падыходы да вызначэння месца тэрміналогіі ў лексічнай сістэме мовы. Сутнасць першага заключаецца ў тым, што тэрміналогія выключаецца за межы лексічнай сістэмы літаратурнай мовы. Але ў такім разе ўзнікае магчымасць самастойнага развіцця тэрміналогіі незалежна ад стану лексічнай, словаўтваральнай, граматычнай і лексіка-семантычнай сістэмы мовы. Аднак такое развіццё як бы дапускае наяўнасць сітуацыі, калі мова з развітай лексічнай сістэмай не можа выконваць навуковыя і адукацыйныя функцыі.

Другога, больш істотнага падыходу да вырашэння гэтага пытання прытрымліваюцца лінгвісты. Яны лічаць, што тэрміналогія ўваходзіць у склад лексічнай сістэмы мовы. Ужо Р.Г. Піятроўскі ў сваім артыкуле “Да пытання аб вывучэнні тэрміна” пісаў пра ўзаемасувязь тэрміналогіі з астатнімі пластамі лексікі мовы, а Б.М. Галавін называў тэрміналогію “падсістэмай лексікі літаратурнай мовы”.

Спецыяльная лексіка – гэта “поле”, пласт у агульнай сістэме лексічнага складу мовы. Межы данага поля не могуць быць статычнымі. Паняцце “тэрміналагічнае поле” было ўведзена А.А. Рэфармацкім. “Толькі ў межах лексічнага поля слова можа атрымліваць сваю значымасць... Ні ў якім разе яго нельга параўноўваць з паняццем кантэксту. Кантэкст – гэта вобласць ужывання слова, маўлення, а поле – сфера яго існавання ў сістэме мовы”. Такім чынам, тэрміналогія – гэта “поле” таго ці іншага тэрміна. “Упарадкаваная тэрміналогія павінна мець двухбаковыя суадносіны: калі ведаеш тэрмін, ведаеш месца ў сістэме; калі ведаеш месца ў сістэме, ведаеш тэрмін” (Реформатский 1996, 151).

Адзначым, што адным з першых на гэтую адметнасць тэрміналогіі звярнуў увагу Д.С. Лотэ, які разглядаў тэрмін як член канкрэтнай тэрміналагічнай сістэмы. Менавіта такі падыход да тэрміна і погляд на тэрміналогію як на сістэму ўзаемазвязаных тэрміналагічных адзінак дае магчымасць правільна будаваць і выбіраць іх, а таксама фармуляваць азначэнні, якія грунтуюцца на дыферэнцыяльных прыметах паняццяў. Д.С. Лотэ вызначыў зыходныя патрабаванні да тэрмінасістэм: “1) у аснове сістэмы павінна ляжаць класіфікацыя паняццяў; 2) тэрмінаваныя прыметы і паняцці павінны адпавядаць класіфікацыйным схемам; 3) тэрміны павінны адлюстроўваць агульнасць паняцця з іншымі і ўказаць на яго спецыфічнасць” (Лотте 1961, 73). Гэтага ж пункта гледжання прытрымліваюцца такія навукоўцы, як Р.В. Вінакур, Л.А. Капанадзе, А.М. Талікіна і інш. Р.В. Вінакур адзначаў, што “семасіялагічныя сувязі паміж значэннямі тэрмінаў аднаго кола ўтвараюць вядомую сістэму, у якой ёсць некаторыя заканамернасці, менавіта гэта і ўказвала на сапраўды істотную прымету тэрміна, якая адрознівае яго як члена сістэмы ад звычайнага слова” (Винокур 1939, 32). Тэрмін не можа існаваць сам па сабе, без якой-небудзь узаемасувязі з іншымі тэрміналагічнымі адзінкамі ў данай сістэме тэрміналогіі. Таму нельга выключыць або ўключыць у гэтую сістэму якую-небудзь частку, не выклікаўшы перагрупоўкі тэрмінаў.

Сістэма тэрмінаў абумоўлена сістэмай паняццяў, таму сістэмнасць тэрміна павінна рэалізавацца ў двух планах: у плане зместу, г. зн. сістэмнасць семантычнага або паняційнага напаўнення тэрміна, і ў плане выражэння, г. зн. сістэмнасць структурнага напаўнення.

У дадзеным артыкуле мы разгледзім сістэмнасць філасофскай тэрміналогіі. Паколькі сістэмнасць праяўляецца ў класіфікацыйных радах, групах, мікрагрупах асобных тэрмінаў, у іх структурнай аналогіі, то для таго, каб высвятліць, наколькі ў данай тэрміналогіі праяўляецца сістэмнасць, звер-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

немся да тэрмінаў, якія ўваходзяць у тыя ці іншыя тэрміналагічныя класіфікацыйныя мікрагрупы, у межах якіх тэрміны дэлімітуюць адзін аднаго і выводзяць свой паняційны змест з мікрагрупы як своеасаблівага цэлага.

Прааналізуем мікрагрупу філасофскіх тэрмінаў, якія называюць філасофскія вучэнні пра першааснову пачатку быцця:

*Дуалізм* – філасофскае вучэнне, якое пачаткам быцця лічыць дзве самастойныя першаасновы (матэрыяльную і ідэальную) (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 23).

*Ідэалізм* – агульнае значэнне філасофскіх вучэнняў, якія сцвярджаюць, што свядомасць, мысленне, духоўнае – першаснае, а матэрыя, прырода, фізічнае – другаснае, залежнае, абумоўленае (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 15).

*Матэрыялізм* – адзін з двух галоўных філасофскіх накірункаў, які ў супрацьлегласць ідэалізму сцвярджае ў сваіх вучэннях першаснасць матэрыі, прыроды і разглядае свядомасць, дух, ідэю, мысленне як другаснае, г. зн. уласцівасць матэрыі (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 41).

Мы бачым, што паняційны змест кожнага з тэрмінаў адлюстроўваецца ў адпаведнай дэфініцыі. З даных дэфініцый вынікае наступнае: узаемасувязь тэрмінаў *дуалізм*, *ідэалізм*, *матэрыялізм* у тым, што яны называюць філасофскае вучэнне пра пачатак быцця. Гэта з'яўляецца інтэгральнай прыметай, якая аб'ядноўвае памянёныя тэрміны ў адну мікрагрупу. Дзякуючы ж дыферэнцыяльным прыметам мы адрозніваем кожнае асобнае паняцце ад іншых у данай мікрагрупе. Так, *ідэалізм* першаасновай быцця лічыць духоўнае; *матэрыялізм* – матэрыю; а *дуалізм* аб'ядноўвае гэтыя два пункты гледжання і вызначае дзве самастойныя першаасновы – матэрыяльную і ідэальную. Такім чынам, можна сказаць, што тэрміны данай мікрагрупы ў плане зместу з'яўляюцца сістэмнымі.

Цяпер разгледзім гэтыя тэрміны ў плане выражэння:

*дуалізм* (ад лац. Dualis – дваісты);
*ідэалізм* (ад лац. Idealis – ідэальны);
*матэрыялізм* (ад лац. Materialis – прадметны).

Усе тэрміны маюць аднатыпную структуру (*ідэалізм*, *матэрыялізм*, *дуалізм*), што дае падставы гаварыць аб сістэмнасці даных тэрмінаў і ў плане выражэння.

Разгледзім яшчэ адну мікрагрупу тэрмінаў са значэннем 'вучэнне пра тэорыю пазнання':

*Сэнсуалізм* – вучэнне ў тэорыі пазнання, якое прызнае адчуванні, пачуцці галоўнай крыніцай пазнання (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 61).

*Эмпірызм* – вучэнне ў тэорыі пазнання, якое лічыць пачуццёвы вопыт адзінай крыніцай ведаў і сцвярджае, што ўсе веды грунтуюцца на вопыце і набываюцца праз вопыт (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 80).

*Фенаменалізм* – вучэнне аб пазнанні, якое зыходзіць з тэзіса аб тым, што непасрэдным аб'ектам пазнання з'яўляецца толькі адчуванне (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 80).

Відавочна, што інтэгральная прымета, з улікам якой фармулююцца азначэнні тэрмінаў данай мікрагрупы, – 'вучэнне ў тэорыі пазнання, аб пазнанні'. Ёсць у вышэйназваных дэфініцыях і дыферэнцыяльныя прыметы, што датычаць крыніцы пазнання і з'яўляюцца сродкам іх размежавання: для *сэнсуалізму* – адчуванні і пачуцці; *эмпірызму* – пачуццёвы вопыт; *фенаменалізму* – толькі адчуванне. Як бачым, сіметрычнае размеркаванне прымет у дэфініцыях сведчыць аб сістэмнасці ў плане зместу. Сістэмнымі з'яўляюцца гэтыя тэрміны і ў плане выражэння, таму што ўтвораны ад каранёў грэчаскага паходжання паводле адной мадэлі з дапамогай лацінскага суфікса -ізм-.

Прааналізуем тэрміны, якія ўваходзяць у мікрагрупу са значэннем 'філасофская катэгорыя':



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

*Бесперапыннасць* – філасофская катэгорыя, якая выяўляе адзінства, узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць элементаў, што складаюць тую ці іншую сістэму (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 14).

*Неабходнасць* – 1) філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае ўнутраныя, устойлівыя, паўторныя, усеагульныя адносіны рэчаіснасці; 2) тое, што абавязкова павінна адбыцца ў дадзеных умовах (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 46–47).

*Прычыннасць* – філасофская катэгорыя для абазначэння генетычнай сувязі паміж асобнымі станамі відаў і форм матэрыі ў працэсе іх руху і развіцця (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 54).

*Узаемадзеянне* – філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае працэсы ўздзеяння розных аб'ектаў адзін на другога, іх узаемную абумоўленасць, узаемапераход, а таксама параджэнне адным аб'ектам другога (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 70).

*Быццё* – філасофская катэгорыя, якая служыць для азначэння ўсяго існуючага: матэрыяльных з'яў і сацыяльных працэсаў, што ўзнікаюць у свядомасці чалавека, а таксама творчых актаў (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 15).

*Адзінкавае* – філасофская катэгорыя, якая выражае адносную адасобленасць, абмежаванасць рэчаў і падзей у прасторы і ў часе, уласцівыя ім непаўторныя асаблівасці (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 7).

*Адноснае* – філасофская катэгорыя, якая характарызуе любую з'яву яе залежнасцю ад іншых з'яў (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 8).

*Канечнае* – філасофская катэгорыя, якая характарызуе ўсялякі азначаны, абмежаваны аб'ект (рэч, працэс, з'яву, стан і г. д.) (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 34).

*Унутранае* – філасофская катэгорыя, якая выяўляе пабудову прадмета, яго састаў, структуру і сувязі паміж элементамі і, як правіла, скрыта ад непасрэднага назірання і выяўляецца ў тэарэтычным даследаванні (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 71).

З прыведзеных вышэй азначэнняў навуковых паняццяў вынікае, што інтэгральная прымета, якая выступае ў якасці апорнага канструкта пры фармулёўцы дэфініцый тэрмінаў і аб'ядноўвае іх у адну мікрагрупу, – 'філасофская катэгорыя'. З другога боку, у кожнага азначэння тэрміна ёсць дыферэнцыяльныя прыметы паняццяў, якія дэлімітуюць іх у межах класіфікацыйных радоў, і гэтыя прыметы, адлюстраваныя ў дэфініцыях тэрмінаў, надаюць апошнім сэнсавую дакладнасць у тэрміналагічным полі філасофіі. Так, для тэрміна *бесперапыннасць* – выяўленне ўзаемасувязі, адзінства элементаў сістэмы; *неабходнасць* – адлюстраванне адносін рэчаіснасці; *прычыннасць* – абазначэнне генетычнай сувязі паміж рознымі станамі форм матэрыі ў развіцці; *узаемадзеянне* – адлюстраванне працэсаў узаемаабумоўленаці аб'ектаў, параджэнне адным аб'ектам другога; тэрмін *быццё* – азначэнне ўсяго існуючага; *адзінкавае* – выражэнне адноснай абмежаванасці рэчаў і падзей у прасторы і ў часе; *адноснае* – характарыстыка залежнасці з'явы ад іншых з'яў; *канечнае* – характарыстыка ўсялякага абмежаванага аб'екта; *унутранае* – выяўленне будовы прадмета. Такім чынам, дэфініцыі тэрмінаў аналізуемай мікрагрупы перадаюць асноўны змест паняццяў, утрымліваюць дастатковы мінімум прымет, неабходных як для разумення і разважання адпаведных паняццяў, так і ўспрыняцця іх у поўным адзінстве, што дае падставы гаварыць пра сістэмнасць данай мікрагрупы ў плане зместу.

Калі звярнуць увагу на структурную пабудову тэрмінаў, то ў межах мікрагрупы вылучаецца некалькі мадэляў, параўн.:

*Бесперапыннасць*, *неабходнасць*, *прычыннасць*; *адзінкавае*, *унутранае*, *адзінкавае*, *канечнае; быццё; узаемадзеянне*.

Аднатыпнасць структуры дае падставы лічыць, што ў плане выражэння тэрміны мікрагрупы са значэннем 'філасофская катэгорыя' толькі часткова сістэмныя ў плане выражэння.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Праілюстраваныя прыклады паказваюць, што для філасофскай тэрміналогіі сістэмнасць характэрна ў плане зместу. Сістэмнасць жа структурнага напаўнення (у большасці выпадкаў) праяўляецца часткова.

Тэрміналагічныя сістэмы розных галін ведаў прасякнуты гіпанімічнымі адносінамі. Гіпаніміяй (ад грэч. hypo – "знізу, пад" і onyma – імя") называюць рода-відавыя адносіны лексічных адзінак. Паводле іх тэрміны падзяляюцца на дзве групы:

а) гіпонімы, якія выражаюць відавыя паняцці;

б) гіперонімы – словы, якія выражаюць родавыя паняцці.

Гэта такі тып сэнсавых адносін, пры якіх змест відавога паняцця аказваецца шырэйшым за змест родавага, а аб'ём – вузейшым. З гэтага вынікае, што гіпонімы ўключаюць у сябе змест гіпероніма і проціпастаўляюцца адзін аднаму дыферэнцыяльнымі семамі. Гіперонімамі і гіпонімамі ў агульнаўжывальнай мове звычайна выступаюць простыя найменні, а ў тэрміналагічнай лексіцы часцей сустракаюцца састаўныя. Апорнае слова словазлучэнняў паўтараецца. У адрозненне ад адзіночных слоў у словазлучэннях дыферэнцыяльная прымета ўводзіцца азначэннем да апорнага слова.

Напрыклад, гіперонім *быццё* падпарадкоўвае сабе рад гіпонімаў: *быццё прыроды, быццё грамадства, быццё чалавека*. Звернемся да больш канкрэтнага аналізу данай групы тэрмінаў і высветлім, наколькі яны сістэмныя ў плане зместу і ў плане выражэння. У іх азначэнні ёсць агульная прымета 'існаванне каго-небудзь або чаго-небудзь': "Істотнай асаблівасцю быцця прыроды аказваецца пластычнасць, г. зн. здольнасць паддавацца знешняму ўздзеянню, праяўляючы пры гэтым розныя ўласцівасці" (Асновы... 1994, 13); "Прырода ахоплівае і пранізвае быццё чалавека, які ўсе зыходныя матэрыялы бярэ ў яе, ды і сам як цялесная істота з'яўляецца яе асобнай часцінкай" (Асновы... 1994, 13); "Непараўнальна больш складаны характар грамадскага быцця, чым прыроднага існавання рэчаў, ёсць праява новага спосабу самаарганізацыі свету, дзе вялікая роля належыць сацыяльным інстытутам і грамадскім адносінам" (Асновы... 1994, 13).

У плане зместу мікрагрупа з'яўляецца сістэмнай. Што ж тычыцца структурнай сістэмнасці гэтых тэрмінаў, то яна праяўляецца часткова, паколькі ўтвораны яны не па адной мадэлі: *быццё прыроды* і *быццё чалавека* – мадэль "$S_1$+$S_2$"; *грамадскае быццё* – мадэль "Adj+$S_1$".

Яшчэ прыклад. Філасофскі тэрмін *прынцыпы дыялектыкі* з'яўляецца гіперонімам для тэрмінаў *прынцып сувязі* і *прынцып развіцця*:

*Прынцыпы дыялектыкі* – гэта ўсеагульныя і універсальныя ідэі, падыходы, якія вызначаюць і раскрываюць сэнс паняццяў і меркаванняў у пазнанні (гл. Асновы... 1994, 41).

*Прынцып сувязі* звяртае ўвагу на прасторавую структурна-сістэмную ўстойлівасць рэчаў і быцця ў цэлым, апісвае "гарызантальныя" сувязі, яны рухаюцца, развіваюцца, маюць генетычныя сувязі (гл. Асновы... 1994, 41).

*Прынцып развіцця* фіксуе другі ўсеагульны бок быцця: рэчы ўзнікаюць і знікаюць, маюць пачатак і канец, змяняюцца (гл. Асновы... 1994, 41).

Мы бачым, што гіпонімы *прынцып сувязі* і *прынцып развіцця* маюць агульную прымету – 'універсальны падыход да асэнсавання дыялектычных паняццяў'. Адрозніваюцца яны тым, што адлюстроўваюць розныя бакі быцця: *прынцып сувязі* – "гарызантальныя" сувязі, а *прынцып развіцця* – змяненне рэчаў. Такім чынам, можна гаварыць пра сістэмнасць мікрагрупы ў семантычным плане.

Даныя тэрміны ўтвораны па адной мадэлі (S+$S_2$), што дазваляе лічыць іх сістэмнымі і ў плане выражэння.

Разгледзім яшчэ адзін прыклад. Гіперонім *законы дыялектыкі* падпарадкоўвае сабе наступныя гіпонімы: *закон адзінства і барацьбы процілегласцей, закон адмаўлення адмаўлення, закон узаемнага пераходу колькасных і якасных змяненняў*.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

*Закон* – неабходная, істотная, устойлівая сувязь паміж з'явамі, рэчамі, працэсамі, якая паўтараецца (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 26).

*Закон адзінства і барацьбы процілегласцей* – адзін з асноўных законаў дыялектыкі, які выяўляе крыніцу самаруху і развіцця прыроды, грамадства і чалавечага пазнання (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 26).

*Закон адмаўлення адмаўлення* выяўляе пераемнасць, сувязь новага са старым, паўтаральнасць на вышэйшай стадыі развіцця некаторых уласцівасцей ніжэйшай стадыі, абгрунтоўвае прагрэсіўны характар развіцця (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 26).

*Закон узаемнага пераходу колькасных і якасных змяненняў* – адзін з асноўных законаў дыялектыкі, згодна з якім змяненне якасці аб'екта адбываецца тады, калі набыванне колькасных змяненняў дасягае пэўнай мяжы; адбываецца рух і развіццё (гл. Скікевіч, Шчур 1996, 26).

Даныя тэрміны сістэмныя ў плане зместу: інтэгральная прымета, якая заключаецца ў дэфініцыі гіпероніма (устойлівая сувязь), аб'ядноўвае гіпонімы, а дыферэнцыяльныя прыметы адрозніваюць іх адзін ад аднаго, паколькі *закон адзінства і барацьбы процілегласцей* выяўляе крыніцу самаруху і развіцця матэрыі; *закон адмаўлення адмаўлення* абгрунтоўвае прагрэсіўны характар развіцця; *закон узаемнага пераходу колькасных і якасных змяненняў* паказвае, пры якіх колькасных зменах адбываецца якаснае змяненне аб'екта.

Што ж тычыцца структурнай арганізацыі тэрмінаў, то назваць яе сістэмнай нельга. Параўнаем: "$S+S_2$+злуч.+$S_2+S_2$", "$S+S_2+S_2$", "S+Adj.+$S_2$+Adj.+ +злуч.+Adj.+$S_2$".

Трэба адзначыць, што з'ява гіпаніміі даволі пашыраная ў філасофскай тэрміналогіі. Прычым сістэмнасць, як правіла, праяўляецца ў плане зместу і ў значнай меры – у плане выражэння.

Увогуле можна сказаць, што «тэрмінасістэма – сукупнасць спецыяльных назваў, якія суадносяцца з адпаведным колам паняццяў. Унутры сістэмы тэрміны падзяляюцца на падсістэмы, класіфікацыйныя рады, арыентаваныя на экстралінгвістычную суаднесенасць і структурную аднатыпнасць. А.В. Крыжаноўская адзначае: “Унутранай састаўляючай тэрміналогіі – яе семантычным напаўненнем дыктуецца катэгарыяльная парадыгматычная абалонка тэрміна – гэта яго моўная (граматычная, словаўтваральная) правільнасць у межах спецыяльнага стылю, прастата сувязі з іншымі словамі”». (цыт. па: Арашонкава 1999, 13).

ЛІТАРАТУРА


Асновы філасофіі: Курс лекцый. Гродна, 1994.

Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. Мн., 1999.

Винокур Г.О. О некоторых явлениях словообразования в русской технической терминологии // Труды Московского института истории, философии и литературы. М., 1939.

Лотте Д.С. Основы построения научно-технической терминологии. М., 1961.

Плотнікаў Б.[А.] Агульнае мовазнаўства. М., 1986.

Реформатский А.А. Введение в языковедение. М., 1996.

Скікевіч А.А., Шчур У.В. Тэрміналагічна-тлумачальны слоўнік па філасофіі. М., 1996.


Паступіў у рэдакцыю 29.04.2002.

***Юлія Мікалаеўна Лук'янюк*** – аспірантка кафедры гісторыі беларускай мовы. Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, прафесар В.П. Красней.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm